ЗАЦВЕРДЖАНА

Распараджэнне дэкана гістарычнага факультэта БДУ

13.02.2012 № 4

# РЭГЛАМЕНТ КОНКУРСУ НАВУКОВЫХ ПРАЦ СТУДЭНТАЎ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ “ВЫТОКІ, СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (ДА 1150-ГОДДЗЯ ПОЛАЦКА)”

1. Конкурс навуковых прац студэнтаў “Вытокі, станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці (да 1150-годдзя Полацка)” скіраваны на стымуляванне навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, папулярызацыю гістарычных ведаў, пашырэнне цікавасці да гісторыі Беларсі, выхаванне якасцяў грамадзянскасці і патрыятызму.

2. Конкурс арганізуецца сумесна саветам маладых навукоўцаў гістарычнага факультэта БДУ (СМН) і адміністрацыяй гістарычнага факультэта БДУ (дэканат). СМН забяспечвае правядзенне конкурсу і падвядзенне яго вынікаў, дэканат стварае ўмовы для заахвочвання ўдзельнікаў і пераможцаў.

3. Удзельнікам конкурсу (канкурсантам) можа быць любы студэнт гістарычнага факультэта БДУ незалежна ад курсу, спецыяльнасці, формы навучання.

Конкурсная праца можа быць выканана індывідуальна альбо ў суаўтарстве (не больш трох аўтараў). У апошнім выпадку прыярытэт пры вызначэнні пераможцаў аддаецца працам, выкананым удзельнікамі навукова-даследчых гурткоў альбо навукова-даследчых лабараторый студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ.

4. Прымаюцца на разгляд працы, прысвечаныя вытокам, станаўленню і развіццю беларускай дзяржаўнасці і звязаным з гэтым пытанням.

Працы павінны быць выкананы самастойна, адрозніваюцца высокім навуковым узроўнем, у тым ліку мець элементы навізны. Праца можа адлюстроўваць вынікі раней праведзеных канкурсантам(і) даследаванняў, альбо быць прысвечана новай тэме.

Праца можа быць выканана самастойна альбо пад навуковым кіраўніцтвам.

Прымаюцца працы на дзяржаўнай мове Рэспублікі Беларусь. Праца павінна быць выканана без памылак, адрукоўвак і г.д. Адказнасць за дакладнасць звестак, цытат, фактаў, прыведзеных у працах, нясуць іх аўтары.

Аб’ём конкурснай працы не павінен перавышаць 30 000 друкаваных знакаў (уключаючы прабелы і сінтаксічныя знакі), з улікам спісу цытаваных крыніц і літаратуры.

Структура працы абавязкова павінна ўключаць:

прозвішча і ініцыялы аўтара (аўтараў);

назву працы;

уводзіны (абгрунтаванне выбару тэмы, пастаноўка праблемы, мэты (мэтаў) даследавання, характарыстыка стану даследаванасці праблемы);

асноўную частку;

заключэнне (выразна сфармуляваныя высновы).

спіс цытаваных крыніц.

Тэкст працы і спасылкі афармляюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да дыпломных работ студэнтаў гістарычнага факультэта (гл. выданне *Курсовая и дипломная работы, магистерская диссертация. Правила подготовки, оформления и защиты : учеб.-метод пособие / сост.: А.М. Назаренко [и др.]. −2-е изд. − Минск : Изд. центр БГУ, 2010. − 68 с.*).

Узоры афармлення тэксту працы і анатацыі размяшчаюцца на афіцыйным сайце гістарычнага факультэта БДУ.

5. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна:

5.1. запоўніць онлайн-заяўку (на кожнага ўдзельніка);

5.2. прадставіць адказнаму сакратару журы конкурса наступныя дакументы (на папяровым носьбіце):

- тэкст конкурснай працы, падпісаны аўтарам/аўтарамі;
- кароткія анатацыі (да 500 знакаў) на беларускай і рускай мовах (афармляюцца на адным асобным аркушы, уключаюць прозвішча і ініцыялы аўтара (аўтараў) і назву працы);
- калі праца выканана ў суаўтарстве – асобны ліст з апісаннем ўклада кожнага аўтара;
- калі праца выканана пад навуковым кіраўніцтвам – асобны ліст з кароткай рэкамендацыяй навуковага кіраўніка, падпісаны ім;

5.3. даслаць на адрас gistfak@gmail.com электронныя версіі тэксту конкурснай працы і анатацыі (файлы – у фармаце .rtf (Rich Text Format) , назва файлу будуецца па схеме – *ПРАЦА_прозвішча.rtf* альбо *АНАТАЦЫЯ_прозвішча.rtf*).

6. Усе матэрыялы павінны быць прадстаўлены ўдзельнікамі конкурсу не пазней за 30.03.2012. Матэрыялы, дасланыя пазней вызначаных тэрмінаў, пакідаюцца без разгляду.

7. Пераможцы конкурсу вызначаюцца па выніках экспертызы конкурсных прац. Экспертызу ажыццяўляе журы конкурсу. Эксперт (ы) па канкрэтнай працы вызначаецца (юцца) старшынёй (яго намеснікамі) і (альбо) адказным сакратаром журы конкурса. Экспертам па конкурснай працы не можа быць навуковы кіраўнік студэнта.

8. Асноўнымі крытэрыямі пры экспертызе конкурсных прац з'яўляюцца навуковы ўзровень, творчы падыход і самастойнасць, адпаведнасць тэме конкурса, здольнасць прадстаўляць вынікі даследавання ў адпаведнасці з наяўнымі патрабаваннямі.

9. Рашэнні журы аб вызначэнні пераможцаў прымаюцца простай большасцю галасоў членаў журы, з'яўляюцца канчатковымі, апратэставанню і абскарджванню не падлягаюць.

Вынікі конкурсу павінны быць падведзены не пазней за 15.05.2012.

10. Вызначаюцца дыпломы першай, другой, трэцяй ступені.

Формы заахвочвання пераможцаў конкурса (запрашэнне да публікацыі ў перыядычным навуковым зборніку і (альбо) дадатковыя балы за навуковую дзейнасць у рэйтынгу студэнтаў і (альбо) дадатковыя балы (0,3) пры фарміраванні чарговасці на атрыманне месца ў інтэрнаце (калі пераможца – з ліку студэнтаў, якія маюць патрэбу ў інтэрнаце) і (альбо) грашовая прэмія і (альбо) каштоўныя прызы і (альбо) іншыя формы) будуць вызначаны журы па ўзгадненні з дэканатам.

11. Усе пытанні, не ўрэгуляваныя ў дадзеным рэгламенце, вырашаюцца журы конкурса.